**Рэліквіі.** Нацыянальная бібліятэка Беларусі атрымала ў дар І том Генадзіеўскай Бібліі, паведамляецца на сайце НББ. Яна ўяўляе сабой першы поўны звод біблейскіх кніг Старога і Новага Запаветаў на царкоўнаславянскай мове, створаны ў 1499 годзе. Генадзіеўская Біблія — унікальны духоўны, гістарычны і культурны помнік рукапіснай спадчыны, які перадала Мінская духоўная акадэмія з нагоды святкавання Дня праваслаўнай кнігі. Рэктар Мінскай духоўнай акадэміі архімандрыт Афанасій уручыў каштоўны падарунак генеральнаму дырэктару бібліятэкі Аксане Кніжнікавай з мэтай умацавання супрацоўніцтва паміж установамі, прыцягнення акадэмічнага інтарэсу да гісторыі і тэксталогіі славянскіх рукапісаў.